УДК 881.6-1

*Г.М. Дашкевіч*

# МАСТАЦКІЯ ПОШУКІ МІКОЛЫ АРОЧКІ Ў ПАЭЗІІ АПОШНІХ ГАДОЎ

М. Арочка адносіцца да пасляваеннай генерацыі беларускіх пісьменнікаў. Яго паэзіі ўласціва шчырасць, пранікнёнасць, багацце вобразнай палітры. Асноўныя рысы, характэрныя яго лірычнаму герою, – пачуццё найвялікшай адказнасці перад часам і сабой, змаганне за сваю Беларусь, яе мову, культуру, будучыню нацыі. Тонкае адчуванне драматызму спалучаецца ў творчасці паэта з інтэлектуальна-філасафічным зместам.

Чалавек і сусвет, адказнасць за ўсё жывое на зямлі, выразнае праяўленне філасафічнасці – асноўныя рысы паэтычнага зборніка М. Арочкі “Матчына жыта”, які, на думку А. Лойкі, гранічна “ўвыпукляе сучасны асэнсавальны пафас беларускай паэзіі”.

Пачуццём адказнасці перад людзьмі, перад пушчамі і барамі, якія пакінуў, “як вецер бяспутны”, каб “біцца ў пытаннях адвечнапакутных”, прагай перадаць спасцігнутую на горкім вопыце “мудрасць сталення” жыве лірычны герой М. Арочкі. Ён з тымі, хто адчувае “жывую вільгаць пад каранямі”, упартасць травы, што “лезе са шчылін апалёных камяніц”, паэзію працавітых рук, якія вымешваюць “хлеба прыпёк прысмужаны”.

Непрымальныя для лірычнага героя М. Арочкі тыя, хто “сцяблом зялёным выплыў ледзь з насення – а ўжо за свет, здаецца, разумней”, калі ў бацькаўскай хаце “валасаты маладзён на бацьку пазірае, як на продка...” Як супрацьпастаўленне гэтаму, як прыклад выхаванасці, высокай культуры гучыць паважлівы, мудры зварот паэта да бацькі: “Як сёння дораг, ойча, твой парог!” (“Да каранёў прыходзім мы пазней...”), да прыроды: “Да цябе я на споведзь, маці-прырода, да цябе за парадаю, ойча-лес” (“Антытэзы”), да Зямлі: “Чаму ж твой закон не адзіны для ўсіх нас, матуля-Зямля?” (“Маланка спаліла арэх”). Прага самаачышчэння ўзмацняе патрабавальнасць лірычнага героя М. Арочкі да іншых, прыводзіць да рашучага адмаўлення антыдухоўнага: “Чаму ж часам родзіш, Зямля, ты нас, як арэхі пустыя” [1, 74].

Многія вершы М. Арочкі пранізаны прадчуваннем катастрофы, якая можа ў любы момант абрынуцца на чалавецтва (“Антытэзы”, “Камоэнс”, “Відавочцы...”, “Ад сябе не ўцячэш”, “Мне дадзена глядзець на зорны спеў”). У вершы “Народжаны ў свеце машын” паўстае вобраз вогненных акіянаў, якія так “раскруцілі на восі старой Зямлю, што за яе зялёны борт з трывогай ухапілася ўсё чалавецтва”.

Вобразы ўпар-травы і параненай яблыні ў аднайменных вершах успрымаюцца як супрацьлеглыя, варожыя адзін аднаму. Упар-трава ўвасабляе ўсё непатрэбнае, наноснае, шкоднае. Параненая яблыня – сімвал Беларусі, якая “гоніць – не згоніць чорны след”, але, насуперак усім нягодам, “чырванее ядрана”:

*Я абмажу глінай – мо яшчэ паправіцца!*
*Як сваё калена – шалем абвяжу.*
*А кара ўсё вышэй жабіцца, каравіцца,*
*А з галіны кожнай – яблык па кашу!* [1, 111]

“Ці скажуць дзе, акрамя як на Слонімшчыне, што кара жабіцца, а не толькі каравіцца?” [2, 4] – піша А. Лойка ў рэцэнзіі на кнігу “Матчына жыта”, высока ацэньваючы яе мастацкія вартасці. Гэтай жа думкі прытрымліваецца Я. Саламевіч у артыкуле “З'яднаны з роднаю зямлёю”, напісаным да 60-годдзя паэта.

Сапраўды, лексічнае багацце, раскаванасць, нюансавасць мовы вершаў і паэм М. Арочкі выцякае з народных першакрыніц, якія фарміруюць, выкрышталізоўваюць, узбагачаюць паэтычны густ мастака.

Трэба адзначыць і другое – высокі свет філасафічнасці праламляецца ў творах паэта лёгка і ўдала. Яго імкненне да скрупулёзнай канкрэтыкі, падрабязнасці фактаў часам прыводзіць да таўталогіі, спрошчанасці, шаблону. Верш “Я – сучаснік...” месцамі нагадвае спрошчаны пераказ багдановічаўскага “Я хацеў бы сустрэцца з Вамі...”:

*Падумайце – хіба гэта не важна? –*
*Мы ўсе ў адзін час*
*разам жывем на зямлі,*
*глядзім у вочы трапяткіх зор,*

МГПУ им. И.П. Шамякина

*спяваем і жалімся ветру і веку,*
*уздыхаем пад ношай трывог...*
*О, як даражыць павінны*
*мы ўсе на зямлі*
*крэўнасцю гэтай...* [1, 109]

Тым не менш М. Арочка не пакідае свайго паэтычнага даследавання верлібра, упарта асвойвае грунт іншых вершаваных формаў. Вялікі патэнцыял творчых пошукаў паэта ў плане мастацкай формы адбіўся на вершах як лірычнага, так і сюжэтнага, прытчава-баладнага складу, у якіх эпічная запаволенасць, уласцівыя тэмпераменту М. Арочкі-паэта, абуджаецца высокім напалам гуманістычнага пафасу, ярасцю дэталі, ёмістасцю вобразаў, "узбуйненай пульсацыяй думкі" (А. Лойка). Найбольш выразна ў апошнія гады гэтая стылёвая асаблівасць адбілася на баладах "Ваўчыца", "Выбар", "Балада пра сабаку", "Балада бульбяногa поля", "Начная балада салдаткі", прытчы "Як бацька спаборнічаў з сонцам".

Глыбокае ўсведамленне значнасці аб'ектыўна-гістарычнай заканамернасці адраджэння беларусаў як нацыі, боль за распятую мову, культуру, імкненне да высокамастацкага, інтэлектуальнага паяднання асабістага і агульначалавечага ўласцівы лірычнаму герою паэтычнага зборніка М. Арочкі "Падземныя замкі" (1986). Беражліва, удумліва, шчыра, узнёсла дакранаецца паэт да "вялікага эпасу памяці". "Падземныя замкі" – працяг усхваляванага маналога лірычнага героя аб прыналежнасці да сваёй трываласці, непахіснасці духоўных сіл народа, узгадаваўшага Скарыну, Гусоўскага, Купалу, Коласа і іншых выдатных дзеячаў беларускай і сусветнай культуры. Высокім гуманізмам прасякнуты творы, прысвечаныя слаўнай кагорце іх паслядоўнікаў: С. Дзяргаю, У. Караткевічу, Г. Леўчыку, В. Таўлаю, У. Хадыку. "У многіх вершах мы як бы прысутнічаем у працэсе самога высвятлення знітаванасці часоў, пазнання ў іх кантэксце саміх сябе, сваіх назапашаных каштоўнасцей, выпакутаваных ідэалаў і надзей", – піша А. Гурская ў рэцэнзіі на кнігу "Падземныя замкі", адзначаючы канцэптуальную значнасць такіх твораў, як "Заклінанне Чыжыка беларускага", прысвечанага Г. Леўчыку, "Замак Уладзіміра", прысвечанага У. Караткевічу, а таксама тых, якія, на думку крытыка, напісаны "самім лёсам аўтара кнігі, нягёгкім перажываннем уласных драматычных і трагічных жыццёвых акалічнасцей" [3, 169] ("Далучэнне да зямлі", "Зямны розум паэта").

Рэха Вялікай Айчыннай вайны прагучала ў зборніку "Падземныя замкі" трывожна і надрыўна, як набат ("Грымеў у кузні за сялом", "Стары сад"). Плённа працягвае распрацоўваць паэт у сваёй творчасці жанр ваеннай балады ("Балада бацькоўскага краю", "Балада блакады"). У гэтых творах мацней, чым у іншых апошніх гадоў, адчуваецца сугучнасць паэзіі М. Арочкі з народна-песеннымі традыцыямі.

Салдат спяшаецца пагаліцца, каб дастойна прыняць смерць на вачах у ворагаў, выконваючы рытуал, завешчаны продкамі. Ён адыходзіць у вечнасць.

*Непераможаны, пекны,*
*Голены, памаладзелы...*
*Чэрці з блакаднага пекла*
*Доўга ў здзіўленні глядзелі..* [4, 31]
"Балада блакады"

Не дайшоў салдат да родных стрэх, згас на снезе ("Балада бацькоўскага краю"), але жыватворны агонь яго душы праступіў праз "цела ўсё ў векавых рубцах", праз шрамы "ад куль – ад мячоў, ад клінкоў, ад дзідаў" сышоў не ў неба, а "падаўся ў свой край, да зямлі радзінай".

Традыцыйнае эпічнае разгортванне сюжэта, такім чынам, убірае ў сябе элементы гратэскавасці, алегарычна-фантастычную форму.

Тое ж назіраецца і ў "Начной баладзе салдаткі", у якой рэальна-бытавая аснова пераплятаецца з неверагодным, таямнічым, што ўласціва баладзе "жахаў". Уся сям'я пазнала ў заснежаным вобліку мужчыны пад акном свайго Антося – мужа, бацьку, сына. Але ён не зайшоў у хату, "пайшоў ён... Мяшок на плячах. Абмоткі... А ўслед – завіруха".

*Мы ноч прахадзілі ў двары.*
*Завея ўзвывала, як жонка...*
*Назаўтра ж ліхія вятры*
*Прынеслі з вайны пахаронку.* [4, 35]

У "Баладзе бульбянага поля" зноў звяртаецца паэт да знявечанага жахам вайны вобраза дзяцінства, за якім "сочыць пагрозна вочка чорнае сталі". Чалавечая годнасць, нянавісць да ворага нараджаюць у душы падлетка "вялікае супраціўленне". Паэт дакладна паказвае гэты працэс далучэння дзіцяці да вялікага ўсенароднага пратэсту ў вершы "Грымеў у кузні за сялом". Строгасць, адточанасць, ашчаднасць кожнага радка адпавядаюць унутранаму стану лірычнага героя – дарослага чалавека, у якім жыве памяць вайны.

Кніга "Падземныя замкі" завяршаецца драматычнай паэмай "Мелодыі Таўлая" ("Шляхі і краты"). Жыццё і творчасць В. Таўлая – паэта-рэвалюцыянера, слыннага свайго земляка – М. Арочка

МГПУ им. И.П. Шамякина

даследаваў плённа і глыбока. Таму заканамерна, што вобраз Таўлая атрымаўся індывідуалізаваным, яркім. На цярністым шляху падпольнай барацьбы сярод болю, кратаў, крыві гартаваліся вершы паэта-змагара. Супярэчлівасць часу і лёсу героя паказана ў творы праз умоўна-алегарычныя вобразы Паэзіі – сімвала жыцця, Падстушіцы – сімвала смерці. Яны прыходзяць да паэта ў апошнія моманты жыцця. Яго душа патрабуе спавядання, і таму з нетраў памяці выплываюць твары загінулага бацькі ("Бацькаў запавет" і "Працяг спаткання з бацькам"), каханых жанчын ("Шыпшына і палын", "Працяг спаткання з каханнем"), карціны "спазнанага ў катоўнях тлуму" ("У Дэфе", "З'яўленне пракурора"), воблікі паліткатаржан, паэтаў-змагароў ("Сустрэча з таварышамі").

Важкім наватарскім укладам у скарбніцу беларускай паэзіі з'явіліся творы, да якіх М. Арочка ішоў усё сваё жыццё – драматычныя паэмы "Курганне" (1979), "Крэва" (1982), "Судны дзень Скарыны" (1991). Яны сталі значным здабыткам нашай літаратуры. "Арганічнае спалучэнне ў яго таленце крытычнага і паэтычнага мыслення садзейнічала творчай рэалізацыі М. Арочкі як паэта эпічнага, філасофскага складу" [5, 4], – слушна адзначае Н. Аксёнчык.

У аснове паэмы "Курганне" – тэма беларускіх Хатыняў, полымя вогненных вёсак. Вайна, спаленая вёска Курганне, жыццё і смерць, пекла і рай увасоблены ў творы праз прызму светабачання юнака Янкі – героя рэальнага і сімвалічнага. Янка рэальны – звычайны ўражлівы сялянскі хлопчык, чуйны да дабрыні. Янка-сімвал – гэта вогненны прывід паэта, які мог прадоўжыць справу Скарыны, Купалы, мог стаць паэтам, але не паспеў, загінуў у пажарышчы вайны.

Душа Янкі мёртвага і пасля апойнага выбыва забыцця не змірылася з драпежнымі носьбітамі цемры і зла – воблікамі "хіжадубых", "глюгастахіжых", "хіжакрылых". Разам з душой загінуўшага бацькі яна шукае супакаення каля продкаў, што "пад каранямі страдрэвіц сядзяць каля кастроў", Скарыны, Праметэя, каб разам з імі "разважыць беды свету".

Бог адвярнуўся ад людзей. І яны змагаюцца за жыццё самі. Іх найвышэйшы Бог, сумленне і спадзяванне – хлеб, вырашчаны, аблашчаны іх працавітымі рукамі.

*З даром ідзеш*
*Да кожнага ты, хлеб.*
*Табе даўно б не шкодзіла –*
*Стаць богам*
*У свеце тым,*
*Што ад злабы аслеп,* [6, 15] –

гаворыць Янка, вогненны прывід паэта. Вобраз хлеба вайны, замешаны на слязах і попеле, – сімвалічны вобраз народнай памяці і веры, супрацьпастаўлены мёртвай рацэ, берагу смерці.

Антыподам Янкі курганнага, яго каханай Тані, яго бацькоў Сцяпана і Усціны, старога Каляды, вуснамі якога прамаўляе хлеб, іх аднавяскоўцаў з'яўляюцца ідаласлужыцелі – вялікі інквізітар Тарквемада, нямецкі паслугач Турац, які ўчыняе допыт хлебу, і карнікі.

І. Багдановіч адносіць "Курганне" да жанру філасофска-сімвалічнай паэмы-прытчы, выдзяляючы дзве асноўныя лініі: лінію Хлеба як увасаблення памяці аб усіх беларускіх Хатынях, якая "павінна стаць бар'ерам перад магчымай новай катастрофай", лінію Скарыны і Праметэя, якая сцвярджае "першародны стан душы як субстанцыі ўсяго самага добрага, светлага і святога" [7, 169]. Сапраўды, спаконвечная ідэя дабрыні і чалавечнасці ў творы М. Арочкі дасягае агульначалавечага гучання праз ракурс нацыянальнага светабачання мастака (трагічны маналог Праметэя, спавядальна-малітоўныя сказы Яна, Скарыны, Хлеба з элементамі прытчы, драматызаваныя дыялогі). Глыбінны сэнс народнай філасофіі па-майстэрску прадстаўлены паэтам праз песню-плач удавы-салдаткі з элементамі народнага галашэння, малітоўнымі зваротамі да Хлеба ("прачысты", "збавіцелько", "благаславены", песню дубовага лісця, якая змешчана ў зборніку "Падземныя замкі" як асобны твор.

У цэнтры паэмы "Крэва" – складаныя падзеі 1385 г., заключэнне Крэўскай уніі паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай. Перад чытачом – складаныя характары канкрэтных гістарычных асоб – Ягайлы, Вітаўта, князя Альшанскага, крыжацкага пробашча Зігбера. Ад іх залежыць лёс Бацькаўшчыны, але ўсе яны па-рознаму адносяцца да яе. Ланцуг канфліктаў спараджаецца барацьбой за ўладу. Мара Ягайлы завалодаць каронай ажыццяўляецца праз кроў і смерць: забойства Кейстута, подкуп, інтрыгі. Маці Ульяна прагне ўлады для сына, падштурхоўвае яго да злачынства. Вітаўт – рашучы праціўнік уніі, навязвання каталіцтва, для яго аднолькава непрымальныя як насілле польскае, так і крыжацкае. Мір для дзяржавы, яе моц, на думку Вітаўта, у незалежнасці.

Праз маналогі-рэфлексіі герояў, іх споведзі перадаецца духоўная энергія часу, узнаўляюцца падзеі, ідзе складаная праца ўнутранага самааналізу, маральнага самаачышчэння. Праз пакутлівае асэнсаванне сваіх памылак прыходзяць бацька і сын – Кейстут і Вітаўт – да высокай ісціны быцця аб асноўным сваім прызначэнні – захаванні дзяржаўнасці, спыненні братазабойства, самавынішчэння. Душа Вітаўта, яго розум і воля кіпяць пратэстам, упэўненасцю, што "невынішчальны дух супраціўлення" не дазволіць праглынуць землі яго Айчыны "пакваапнай пашчай уній".

Паэме ўласціва багацце лексікі, напружанасць, унутраны дынамізм, яркасць вобразнай структуры. Вобраз народа, яго рэакцыя на падзеі, радасць, абурэнне пададзены эскізна, найбольш выразная сцэна – "На жэглішчы", калі ідзе барацьба за вызваленне Вітаўта з турмы.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Важкім дасягненнем сучаснай беларускай літаратуры стала драматызаваная паэма М. Арочкі "Судны дзень Скарыны". З глыбінь XVI ст. паэт выводзіць светлы воблік беларускага першадрукара. У прадспеве-зычыне лірычны герой выклікае дух мудрага настаўніка з'явіцца на сваю пакутную зямлю, дзе і праз пяць стагоддзяў ідзе зацятае змаганне "за родны край, за мову і за душу". Гістарычны дом Скарыны – набытак усяго славянства, Еўропы, чалавецтва:

*Я – родам з Адраджэння,*
*Ды цяпер*
*Усім часам, прасторам я належу:*
*Прадонню – прахам,*
*А душой – бязмежжу,*
*Іншабыццю разумна-чуйныў сфер!* [8, 7]

Прамаўленне Духу Скарыны, матыў яго малітвы аб родным краі – своеасаблівая падсветка твора, той промень духоўнасці, які, праходзячы праз стагоддзі, западае ў сэрца нашага сучасніка. Аўтар даследуе ў гістарычным і ў эстэтычным мастацкім планах самы драматычны час у жыцці першадрукара, калі пасля выдання яго кніг на роднай мове, з якой Бог "на свет пусціў", ён не знайшоў падтрымкі і разумення на радзіме. Пад уплывам вярхоўных правіцеляў і царкоўных іерархаў, паўстаўшых супраць Скарыны і яго сям'і, пачынаюцца траўля, ганенне, абвінавачванні. У выніку – турэмнае зняволенне і смерць жонкі Маргарыты.

Усе сюжэтныя калізіі твора (рэальныя, бытавыя, сацыяльна-палітычныя падзеі) так ці інакш закранаюць самую істотную праблему, у якой сканцэнтравана сутнасць жыцця Скарыны – ідэю Асветы, культуры, нацыянальнага Адраджэння. Неадрыўны ад вобраза Скарыны вобраз багіні духоўнасці – Кнігі, божага дару, здабытку вышыняў розуму чалавецтва. Гэта з-за яе ён ахвяраваў сабой, з-за яе ідзе напружаная барацьба Святла і Цьмы. Яна, кніга на роднай мове беларусінаў, прымушае іншаземцаў схіліць галовы. Іх сэрцы шчымяць ад зайздрасці і жадання папоўніць прагалы сваёй культуры за кошт таленту славутага доктара і кніжніка. Але Скарыну не ўсё роўна, дзе служыць Асвеце. Сярод бруду, павуціны і плесені халодных сцен цямніцы ён чуе галасы Яна Гуса, Міколы Гусоўскага, святога Іова-праведніка, нябожчыцы-маці, Маргарыты. Ідзе вялікая праца душы і розуму, пазнанне самога сябе:

*Ты для мяне ўсявышні – гэта кніга,*
*Ты для мяне ўсявышні – гэта край*
*Радзінны, пасваліты мой,*
*Зямля.*
*Якую я і тут, за бруднай кратай,*
*Прачыстаю сню і ўспалымнелым зрокам*
*І сэрцам клічу з цемры да Асветы.* [8, 82]

Дух Асветы нараджае ў чалавеку дух свабоды. Вось чаму з аднолькавым адчужэннем адносяцца да Скарыны і ў княскім палацы ў Вільні, і ў Маскве, дзе Скарына шукае падтрымкі ў справе кнігадрукавання. На радзіме ні князь Астрожскі, ні Радзівіл яго не падтрымалі. Магнаты і рэлігійныя вяльможы называюць яго ерэтыкам, чарнакніжнікам. Ён жа самаахвярна нясе крыж верацярпення нават пасля таго, калі ад яго адвярнуліся аднадумцы – Багдан Онкаў і Якуб Бабіч. М. Арочка тонка, псіхалагічна заглыблена перадае стан душы свайго героя, даведзенага да роспачы, да слёз.

Няма ў творы звыклай статычнасці, запраграмаванасці, якой амаль немагчыма пазбегнуць пры абмалёўцы асобы значнай, велічнай. Аўтар глыбока раскрывае характар Скарыны-генія і звычайнага чалавека, непахіснасць яго духу, цвёрдасць у дыскусіях з палітычнымі і рэлігійнымі дзеячамі Альбрэхтам Прускім, Бонай, астрожскім, мітрапалітам Данілам. Побач з Маргарытай і маці ён мяккі, пяшчотны, спавядальна-шчыры. Як і ў іншых паэмах, М. Арочка спалучае элементы рэалістычныя і ўмоўна-сімвалічныя. Рамантычна-ўзвышаны пафас мовы Скарыны, які ў сваіх разважаннях, дыялектычных роздумах, спрэчках раскрываецца як філосаф, вучоны, бліскучы прамоўца.

Зборнікі вершаў М. Арочкі апошніх гадоў ("Бяздоннае", 1985; "Колас на ржышчы", 1980; "Памяць зярнятаў", 1991; "Голос аиста", 1975; "Листая памяти страницы", 1990), у якіх змешчаны выбраныя творы паэта, высока ацэнены крытыкай.

Вельмі высока ацэнены літаратуразнаўчыя кнігі М. Арочкі "Валянцін Таўлай" (1989), "Галоўная служба паэзіі" (1974), "Сучасная беларуская паэзія" (1976), "Беларуская савецкая паэма" (1979), "Саюз часу і майстэрства" (1981), "Максім Танк: Жыццё ў паэзіі" (1984), "Поэзия и война" (1987), а таксама яго пераклады з рускай, латышскай, польскай і англійскай моў.

***Літаратура***


1. Арочка М. Матчына жыта. – Мн., 1978.
2. Лойка А. Зямлі патрэбна жыта // Літ. і мастацтва. – 1978. – 15 верас.
3. Гурская А. Пазнанне родных глыбіняў // Маладосць. – 1987. – № 8.
4. Арочка М. Падземныя замкі. – Мн., 1986.
5. Аксёнчык Н. Памяць спелых зярнятаў // Літ. і мастацтва. – 1993. – 21 мая.


МГПУ им. И.П.Шамякина

6. Арочка М. Курганне. Крэва. – Мн., 1982.
7. Богданович И. Отсветы огня // Нёман. – 1984. – № 3.
8. Арочка М. Судны дзень Скарыны. – Мн., 1991.

***Summary***

The article concerns the artistic search of M. Arocnka in his last years poetry.

*Поступила в редакцию 03.11.03.*